*Пацыенка С. А.*

# МАГЧЫМАСЦІ ВЫКАРЫСТАННЯ ІНАВАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ ПРЫ СТВАРЭННІ ЭКСПАЗІЦЫЙ У ЗАМКАВЫХ КОМПЛЕКСАХ

На тэрыторыі Беларусі была пабудавана значная колькасць замкаў, пераважная большасць якіх да нашага часу амаль не захавалася. Менавіта з прычыны дрэннага стану сёння ў якасці рэальных музейных аб'ектаў можна разглядаць адзінкавыя пабудовы, такія як Гродзенскі, Мірскі, Нясвіжскі. У бліжэйшы час плануецца рэканструкцыя Лідскага замка.

Патэнцыял замкаў у якасці аб'ектаў культурнага турызму вялікі. Аналізуючы дзейнасць беларускіх турфірмаў можна заўважыць, што замкі з'яўляюцца адным з самых папулярных экскурсійных аб'ектаў. Акрамя таго, кожны з замкаў, які сёння функцыянуе, мае ўласную спецыялізацыю. Так, мірска-нясвіжскія ваколіцы сталі месцам правядзення музычных фестываляў і вечароў (штогадовы нацыянальны фестываль камернай музыкі «Музы Нясвіжа», «Музычныя вечары ў Мірскім замку», «Мірскі фестываль мастацтваў» і інш.). Лідскі замак зарэкамендаваў сябе як своеасаблівы цэнтр рыцарскага руху і месца правядзення святаў сярэдневяковай культуры (фестывалі «Замак Гедыміна», «Меч Лідскага замка» і інш.). У памяшканні Гродзенскага замка размяшчаецца Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей.

Нягледзячы на такую папулярнасць замкаў, магчымасці выкарыстання замкавых плошчаў значна большыя. Аднак уключэнне замкавых комплексаў у сучасны культурны кантэкст патрабуе значных намаганняў. Праблемы заключаюцца ў якаснай рэстаўрацыі помнікаў, адсутнасці неабходнай колькасці экспанатаў для музейных экспазіцый, недастаткова развітай інфраструктуры,

рэдкім выкарыстанні інавацыйных тэхналогій у экскурсійным абслугоўванні.

Функцыянаванне замкаў у якасці турыстычных аб'ектаў патрабуе добра развітай інфраструктуры. Развіццё турысцкай індустрыі ў Беларусі яшчэ не дасягнула ўзроўню сусветных стандартаў. Разам з тым змяніць сітуацыю павінна была Нацыянальная праграма развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь на 2006–2010 гг., якая ўтрымлівала значную колькасць дзейсных прапаноў па паляпшэнні сітуацыі ў гэтай галіне .

На сённяшні дзень дрэнная захаванасць многіх помнікаў дойлідства з'яўляецца сапраўднай перашкодай для развіцця турызму. У беларускіх умовах татальных страт архітэктурных помнікаў трэба змяняць свядомасць: помнік можа быць не толькі аўтэнтычным, але і адноўленым у сваім арыгінальным выглядзе. Адбудовы нанава — гэта адзіны шлях да таго, каб вярнуць Беларусі еўрапейскае аблічча. Праца па аднаўленні павінна праводзіцца з усёй скрупулёзнасцю і адказнасцю: з прыцягненнем значнай колькасці навукоўцаў, прафесійных даследчыкаў, замежных спецыялістаў. Таксама мае сэнс выкарыстоўваць працу найбольш здольных і таленавітых студэнтаў пад кіраўніцтвам кваліфікаваных спецыялістаў.

Існуе аб'ектыўная праблема напаўнення музейных экспазіцый. Калі вядзецца гаворка пра замкі, узнікае істотная перашкода: амаль цалкам страчана магнацкая культура Беларусі, практычна не засталося яе артэфактаў. Калі этнаграфічныя музеі яшчэ могуць папаўняцца знаходкамі, прывезенымі з экспедыцый па розных мясцінах краіны, дык шукаць рэшткі культуры беларускіх арыстакратаў могуць толькі рамантыкі ці аматары прыгод. Аднак і гэтая праблема можа быць вырашана некалькімі шляхамі. Гістарычная рэканструкцыя дазволіць наведвальнікам убачыць макеты зброі, харугваў, узноўлены магнацкі касцюм, муляжы старадаўніх страў і г.д. Напрыклад, эфектна выглядае макет вершніка на кані ва ўсёй баявой экіпіроўцы ў рэальным памеры, выстаўлены ў адной з залаў замка ў Мальборку (Польшча). Створаны ў поўнай адпаведнасці з гістарычнай рэчаіснасцю, такі экс-

панат мае каштоўнасць у якасці рэканструкцыі баявой экіпіроўкі коннага воіна пэўнага перыяду.

Вырашыць праблему напаўнення музейных экспазіцый у замкавых комплексах магчыма з дапамогай сучасных інфармацыйных тэхналогій. Стварэнне мультымедыйных кампазіцый дазволіць выкарыстоўваць віртуальныя копіі экспанатаў з іншых музеяў. Рэальным уяўляецца выкарыстанне мультымедыйных магчымасцяў у працэсе стварэння інтэрактыўнай экспазіцыі, якая б адлюстроўвала гістарычныя этапы фарміравання замкавага комплексу. У гэтым выпадку наведвальнікам прадастаўляецца ўнікальная магчымасць прасачыць лёс помніка, убачыць шматлікія перабудовы і разбурэнні ў розныя перыяды яго існавання. Падобная практыка з поспехам выкарыстоўваецца ў Тракайскім замку (Літва). Своеасаблівыя «інфакіёскі», размешчаныя ў некаторых памяшканнях замка, змяшчаюць візуальную інфармацыю пра гістарычныя этапы існавання помніка.

Закранаючы праблему музейных экспазіцый, хацелася б звярнуць увагу на прынцыпова новую канцэпцыю дзейнасці музеяў. Сучасная сацыякультурная сітуацыя патрабуе пераасэнсавання традыцыйных падыходаў да музейнай справы. Тым больш гэта датычыцца такіх спецыфічных структур, як замкавыя комплексы. Замкавая прастора мае вялікія магчымасці для ажыццяўлення пазнавальнай, творчай, рэкрэацыйна-забаўляльнай дзейнасці.

Інавацыйны падыход да арганізацыі экспазіцый падразумявае актыўнае ўцягненне наведвальніка ў працэс музейнай камунікацыі. Роля пасіўнага назіральніка змяняецца дзейснай пазіцыяй творцы. Напрыклад, наведвальнікам замка можна прапанаваць уключыцца ў практычную дзейнасць. Вядома, што ў XVII ст. на перадзамчышчы Мірскага замка звонку быў прыбудаваны шэраг мураваных гаспадарчых пабудоў. Паводле інвентару 1778 г. у Мірскім замку меліся: стайня, кузня, кухня, пякарня, бровар, лазня, кандытарская, шмат іншых разнастайных кладовак і складоў. На замкавым двары можна арганізаваць для турыстаў майстар-класы па стварэнні разнастайных рэчаў, прызначаных для замкавага побыту. Не проста дэманстрацыя майстэрства вырабу тых ці іншых прадметаў альбо

прадуктаў, а непасрэдны ўдзел у працэсе дазволіць наведвальнікам яшчэ больш адчуць спецыфіку жыцця ў замку.

Працэсу актывізацыі цікавасці наведвальнікаў садзейнічаюць таксама такія сучасныя формы музейнай камунікацыі, як выкарыстанне метадаў тэатралізацыі і ролевай гульні. Сцэнічныя пастаноўкі на гістарычную тэматыку, ажыццёўленыя ў замкавых інтэр'ерах, не толькі выклікаюць інтарэс у турыстаў, але і з поспехам будуць выконваць адукацыйную функцыю, бо сузіранне адпаведнага відовішчнага вобраза павышае эмацыянальнасць успрымання гістарычнай інфармацыі, садзейнічае яе лепшаму запамінанню. Асабліва эфектыўнае выкарыстанне такіх формаў пры рабоце з групамі школьнікаў.

Адзначым, што вопыт па ўкараненні метада тэатралізацыі ўжо некалькі гадоў выкарыстоўваецца ў Лідскім замку. У 2006 г. турфірмай «Святавіт» і клубам вайскова-гістарычнай рэканструкцыі «Дайнова» пры падтрымцы гісторыка-мастацкага музея быў створаны арыгінальны праект «Старадаўніх муроў адраджэнне». Праект складаўся з агляднай экскурсіі па замку, тэатралізаванай мініяцюры «Вяселле Ягайлы», дэманстрацыі рыцарскіх паядынкаў на замкавым двары і вогненнага шоу. Поспех дадзенай праграмы ў турыстаў натхніў арганізатараў на стварэнне ў 2008 г. другога тэатралізаванага прадстаўлення — «Княжы суд».

У сучасных умовах шпаркага развіцця інфармацыйных тэхналогій асаблівае значэнне набывае дапаўненне экспазіцый такімі элементамі, як гук, святло, пах. Гучанне старажытнай музыкі, імітацыя прыглушанага святла факелаў, агонь сапраўднага каміна, стравы старажытнай беларускай кухні — уздзеянне на ўсе органы пачуццяў дапамагаюць найбольш поўна ўспрыняць атмасферу мінулага, адчуць гістарычны час ва ўсім багацці яго праяўленняў. Аўдыёэкскурсіі стала занялі сваё месца ў сусветнай музейнай практыцы (шырока вядомыя экскурсіі па музеі арыштанцкага побыту ў Алькатрасе (ЗША), экскурсія «Пецярбург Дастаеўскага» (Расія) і інш.). «Агучванне» экспазіцый уяўляецца нам перспектыўным накірункам у працэсе напаўнення сучаснай замкавай прасторы. Гукі замка розных гістарычных перыядаў (гукі асады: выбухі,

крыкі, конскі тупат; гукі ўрачыстых мерапрыемстваў: гучанне паланэза, вясёлыя размовы ўдзельнікаў баляванняў і інш.) будуць садзейнічаць узмацненню эмацыянальных уражанняў наведвальнікаў.

У працэсе арганізацыі сучаснай прасторы беларускіх замкаў мы прапануем выкарыстаць канцэпцыю «засялення» замка. Замак — гэта перш за ўсё жылая плошча, а значыць яе існаванне не абыходзілася без людзей. Магнаты, сяляне, рамеснікі, салдаты гарнізона — толькі іх прысутнасць здольна вярнуць замку яго арыгінальны выгляд. Узнаўленне выключна архітэктурных элементаў не дае магчымасці стварыць цэласную карціну замкавага жыцця. На наш погляд, сучасным беларускім замкам не хапае менавіта антрапалагічнага кампанента. Арыгінальнасць падыходу да напаўнення замкавай прасторы шляхам з'яўлення «насельніцтва» (васкавыя скульптуры, жывыя артысты, удзельнікі рыцарскіх клубаў і інш.) можа зрабіць беларускія замкі сапраўдным брэндам.

Беларуская гісторыя склалася такім чынам, што значная колькасць прадстаўнікоў магнацкіх радоў была вымушана выехаць за мяжу. Замкі — радавыя гнёзды магнатаў, засталіся пакінутымі. Для беларускай культуры сёння надзвычай важна падтрымаць магнацкі дух былых рэзідэнцый. Сучасныя магчымасці стварэння музейных экспазіцый дазваляюць вярнуць гаспадароў на радзіму, няхай і шляхам тэатралізацыі альбо віртуальнай прысутнасці.